# Радкі з прызнання ў любові

**Перадаць знешнюю прыгажосць беларускай прыроды і яе духоўную веліч — галоўная мэта творчасці Алены Майсеенкі. «У краі азёр» — пад такой назвай жывапісец, якая адносна нядаўна пачала свой шлях у мастацтве, прадставіла выстаўку ў галерэі «Універсітэт культуры». Пазнаёміцца з экспазіцыяй можна да 16 жніўня.**



*«Нарцысы».*

Размова пра тое, што жанр пейзажу вычарпаў сябе, вядзецца вельмі даўно. Хто толькі ні выступаў з аргументамі на карысць гэтага меркавання, якімі рознымі гэтыя роздумы толькі ні былі… З асноўнага — у жанры часцяком працуюць людзі неталенавітыя, няздольныя выказацца на іншыя тэмы; пейзаж дазваляе хавацца ад сучасных рэалій; многія жывапісцы засяроджаны на перадачы складаных пачуццяў і нацэлены выклікаць тыя ж пачуцці ў гледача — такім чынам не вырашаецца ніводнай інтэлектуальнай задачы. І ўсё ж, нягледзячы на крытыку жанра, на яго моцную повязь з традыцыяй, кпіны і папрокі ў бок пейзажыста, жанр застаецца адным з ключавых у мастацтве. Да яго звяртаюцца мастакі ва ўсім свеце, і глядач, што важна, таксама неабыякавы да іх пошукаў і знаходак.

Сапраўды, тэма ўзаемадзеяння чалавека і прыроды — важная частка сусветнага актуальнага мастацтва. Нехта фіксуе, як мяняюцца адносіны чалавека да навакольнага асяроддзя, кагосьці цікавяць праблемы экалогіі, іншыя па-даўнейшаму праз адлюстраванне прыроды выяўляюць свае думкі, пачуцці, эмоцыі аб чым заўгодна — ад унутраных супярэчнасцяў да пакарэння космасу.

Алена Майсеенка адносіцца якраз да апошняй кагорты, аднак засяродзілася яна выключна на адлюстраванні гармоніі, то бок сувязі адчування ўнутранага спакою і прыроднага хараства. Гэтую ідылію аўтар перадае надта сціплымі, абмежаванымі сродкамі — просты, часам пастозны мазок, сціплая колеравая палітра… Адсутнасць любога руху робіць сюжэты застылымі, быццам час не запаволіўся, а спыніўся. Зразумела, дзесьці мужчына і жанчына са сваім гадаванцам прагульваюцца ўздоўж набярэжнай, тут па парку едзе веласіпедыст — на гэтым увесь рух на палотнах жывапісца і заканчваецца. Хіба толькі вецер кране апалае лісце ці варухне веткі бярозы… Наяўнасць пустаты ў пейзажах Алены Майсеенкі сведчыць і пра светапогляд мастачкі, і пра яе прыхільнасці ў выяўленчым мастацтве, і пра творчы метад, якім кіруецца. Жывапісец робіць, відавочна, зразумелыя публіцы спробы адлюстравання навакольнага свету — гэта бачна нават па ракурсе, якому аддае перавагу аўтар: на ўзроўні вачэй. Гэтае, здаецца, не заўсёды наўмыснае імкненне да пазнавальнасці і будзённасці выявы суседнічае з пазбаўленнем прыроды разнастайнасці — амаль кожны сюжэт камерны і так ці іначай падобны да іншага, не вызначаецца адметнымі дэталямі.

На выстаўцы «У краі азёр» прадстаўлены тэматычныя пейзажы, а таксама гарадскія краявіды, прысвечаныя прыроднай і архітэктурнай прыгажосці Мінска і Нясвіжа. Архітэктура паказана даволі фрагментарна — як фон для роздумаў Алены Майсеенкі пра любімыя мясціны, як некалькі радкоў з прызнання ў любові да Радзімы. Матывы гэты, вядома, асноўны для многіх айчынных пейзажыстаў, таму канкурэнцыі тут не пазбегнуць. Беларуская публіка даўно вызначылася са сваімі ўлюбёнцамі, і пантэон гэты непарушны. Пакуль — сучасным аўтарам, як бачна па шматлікіх выстаўках і фестывалях, ёсць што прапанаваць гледачу.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**



*«Цвіценне».*



*«Каля Нясвіжскага замка».*



*«На захадзе сонца».*